Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ
ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТ-ІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, р. Карла Маркса і Чырвонаармейскай, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 9 (142)	21—31 сакавіка	1934 г.

ЗМЕСТ

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД ЗА ДЭКАДУ

Гэтая дэкада характэрна сваёй цыкланічнай дзейнасцю, якая прыходзіць з тэрыторыі Англіі, праходзіць праз Заходнюю Еўропу, БССР і Балтыку і ідзе далей на Барэнцава мора.

На працягу ўсёй дэкады праз нашу тэрыторыю праходзіць рад цыклонаў, дзякуючы чаму ўвесь гэты час наглядалася цёплае, пахмурнае і з праходзячымі ападкамі надвор'е.

У першы дзень дэкады назіралася наступнае размеркаванне барычных вобласцей: цэнтр вобласці высокага ціску знаходзіўся на паўночным Урале, а максімум працягваўся па ўсяму Савецкаму Саюзу, даходзячы да тэрыторыі БССР.

Над Заходняй Еўропай знаходзілася вобласць нізкага ціску, якая рухалася на паўночны ўсход.

Увесь астатні час да 31-га сакавіка тэрыторыя БССР знаходзіцца пад уплывам нізкага ціску і толькі 31-га сакавіка з боку Скандынавіі ўваходзіць вобласць высокага ціску.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ на карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядаўся мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	3	3	5	3	3	4	2	3	3	3	1	3	—	8	0	25
	3	Полацак	3	2	5	3	3	4	3	3	3	3	2	3	0	9	—1	31
	—	Вялікія-Лукі	3	2	3	2	2	2	5	3	2	2	1	2	—	10	—1	31
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	7	Нова-Каралёва	1	1	4	2	2	3	4	2	3	3	0	2	—1	10	—2	28
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	5	4	6	4	4	5	4	3	4	3	0	4	—	9	—1	26
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	5	5	6	4	5	5	5	3	5	4	1	4	1	14	—2	26
	93	Менск	5	6	7	3	5	8	2	5	3	6	4	4	0	15	—2	23
	16	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	4	7	6	3	6	9	3	4	5	4	1	5	0	16	—2	31
	25	Асіпавічы	4	7	7	4	8	10	6	8	5	3	2	6	1	17	—2	28
	10	Орша	2	2	5	4	5	5	5	3	4	3	0	3	0	11	—3	28
	19	Горкі	2	2	5	3	4	4	5	2	3	3	3	3	—1	11	—3	28
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	5	8	7	3	8	10	3	4	5	4	3	5	—	15	—1	28
	30	Мар.-Сосны	5	9	6	4	9	10	5	4	5	3	3	6	2	16	—2	28
	21	Магілеў	3	3	6	3	6	6	5	4	3	2	0	4	0	13	—2	28
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	3	3	7	3	6	7	7	4	3	3	1	4	0	15	—1	28
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	3	5	6	4	8	8	5	4	3	2	1	4	1	15	—2	28
	32	Жлобін	3	6	6	4	9	8	5	4	4	3	3	5	1	16	—2	28
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	6	8	8	5	9	11	5	4	6	4	4	6	2	17	—3	28
	37	Калінкавічы	6	8	8	6	10	11	6	4	4	4	4	6	2	17	—2	28
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	4	5	9	5	9	10	7	4	3	3	3	6	1	16	—1	30
	35	Васілевічы	6	8	9	5	10	11	7	4	4	3	3	6	1	17	—2	30
	40	Людвінава	8	9	10	8	10	10	7	5	4	4	5	7	2	18	—2	31

ых назіранняў за 21—31 сакавіка 1934 г.

	Чысло, калі нагляд. мінімум	… паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм: 21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сума	Метэаралагічная з'ява (у дужках адзначаны чыслы)
	25	82	—	—	—	0.5	11.0	3.0	0.5	2.0	..	4.0	0.5	4.0	..	..	25.5	туман (21, 22)
	31	81	—	—	—	1.0	9.0	0.1	..	3.0	..	3.0	..	..	..	..	16.1	туман (22, 23)
	31	83	15	—2	31	1.0	2.0	1.0	0.1	3.0	0.1	2.0	0.1	4.0	..	..	13.3	туман (21, 23)
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	76	15	—5	31	..	9.0	..	..	..	..	4.0	..	..	..	.	13.0	туман (21, 22)
	26	74	—	—	—	..	6.0	0.2	1.0	0.1	..	3.0	..	..	..	..	10.3	туман (23, 26)
	—	—	—	—	—	0.2	4.0	0.2	1.0	0.8	..	3.0	..	..	..	..	9.2	туман (22, 26)
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
2	26	77	—	—	—	0.1	3.0	..	..	..	..	3.0	..	..	..	..	6.1	туман (21, 22)
2	23	74	21	—7	23	0.4	5.0	..	0.1	0.1	..	4.0	..	..	..	..	9.6	туман (21, 25, 26, 28, 29)
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
2	31	71	17	—2	28	1.0	1.0	..	0.2	0.1	..	2.0	0.5	..	..	..	4.8	туман (23)
2	28	64	—	—	—	1.0	3.0	..	0.2	..	..	1.0	..	..	..	..	5.2	туман (21, 22)
3	28	82	—	—4	28	0.6	5.0	..	..	..	..	2.0	..	..	..	..	7.6	туман (21, 22)
3	28	80	16	—4	29	2.0	7.0	..	..	..	..	3.0	..	..	..	..	12.0	туман (21, 22)
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
1	28	74	—	—3	28	..	3.0	4.0	..	..	..	..	3.0	..	..	..	10.0	туман (23)
2	28	63	—	—5	28	0.1	0.2	..	1.0	0.2	..	1.0	..	..	..	..	2.5	туман (21)
2	28	77	—	—	—	7.0	6.0	..	..	..	..	4.0	..	..	..	..	17.0	туман (21, 23)
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
1	28	74	—	—	—	1.0	5.0	..	..	0.3	..	0.5	..	..	..	..	6 8	туман (21, 22)
	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
2	28	71	21	—2	28	1.0	5.0	0.1	0.3	0.2	0.1	2.0	..	..	..	..	8.6	туман 23
2	28	69	—	—	—	0.5	4.0	0.1	1.0	0.1	.	2.0	0.2	0.1	..	..	8.0	туман (21, 22)
-3	28	63	—	—	—	0.5	0.2	0.1	0.1	0.1	..	1.0	..	..	..	..	2.0	туман (26, 31)
-2	28	68	—	—	—	..	0.5	..	0.1	..	..	0.2	..	..	..	..	0.8	туман (21, 22)
-	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
-	—	—	—	—	-	14.0	3.0	..	0.3	..	..	1.0	..	..	..	..	18.3	туман (22, 26)
-	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
-1	30	66	—	—	—	4.0	1.0	0.3	..	..	..	..	..	..	..	..	5 3	туман (21, 22)
-2	30	75	—	—3	28	0.1	1.0	..	0.6	..	..	1.0	..	..	..	..	2.7	туман (21, 22)
-2	31	64	23	—3	30	0.4	0.1	0.6	1.0	0.1	..	..	..	..	..	..	2.3	туман (22)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 21—31 сакавіка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўнага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	E	4	SW	7	—	9	9	мокрая
	3	Полацак	E	4	E	4	—	9	8	»
	—	Вялікія Лукі	S	4	S	9	—	9	8	»
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	E	4	E	7	13	9	8	мокрая
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	S	4	E	10	—	8	6	мокрая
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	»
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SE	4	SW	7	—	8	6	мокрая
	16	Менск	SE	4	E	10	—	8	6	вільготная
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	SE	4	NE	14	—	8	6	мокрая
	25	Асіпавічы	SE	4	NE	7	—	8	6	вільготная
	10	Орша	SE	2	S	—	—	8	3	»
	19	Горкі	SE	4	NE	14	—	8	8	мокрая
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	SE	1	SE	10	—	6	6	—
	30	Мар'іна-Сосны	E	4	E	14	—	6	3	вільготная
	21	Магілеў	SE	4	SE	7	—	8	5	мокрая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SE	4	SE	10	—	8	6	замерзшая
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	SE	4	S	14	—	8	6	мокрая
	32	Жлобін	E	6	SE	10	—	8	3	мокрая
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	SE	4	SE	10	—	8	2	мокрая
	37	Калінкавічы	SE	4	NE	12	—	5	2	сухая
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	SE	4	E	14	—	6	3	мокрая
	35	Васілевічы	SE	4	SE	7	49	7	3	вільготная
	40	Людвінава	E	6	S	9	—	9	5	мокрая

У першыя дні дэкады 21-га і 22-га сакавіка на тэрыторыі БССР знаходзяцца прагрэтыя масы кантынентальна-палярнага паветра і тэмпература ў гэтыя дні дасягала на поўдні краіны да +12 +13 градусаў. На змену гэтай масе ўваходзіць з захаду больш цёплае морскае палярнае паветра, якое ўтрымліваецца на нашай тэрыторыі 23-га і 24-га сакавіка, стварае пахмурнасць і ападкі, а таксама павышэнне тэмпературы, якая даходзіць у раёнах Жыткавічы і Калінкавічы да +14 +15 градусаў.

25-га і 26-га сакавіка на тэрыторыю БССР уваходзяць з паўднёвага захаду яшчэ больш цёплыя масы кантынентальна-палярнага паветра, вельмі блізкія па свайму характару да субтрапічнага паветра. У гэтыя дні наглядаецца памяншэнне воблачнасці, спыненне ападкаў і павышэнне тэмпературы да +18 градусаў на поўдні рэспублікі і да +14 +15 градусаў на поўначы.

У далейшыя дні—27-га, 28-га, 29-га сакавіка ўтвараецца выхаладжэнне гэтай цёплай масы, і тэмпературы ноччу дасягалі да 0—1 градуса з захаваннем значнай воблачнасці і спыненнем ападкаў па ўсёй краіне.

30-га і 31-га сакавіка на тэрыторыю БССР уваходзяць халодныя масы морскага арктычнага паветра, якія прыносяць з сабою значнае паніжэнне вільготнасці, памяншэнне воблачнасці да яснага неба і паніжэнне тэмпературы ноччу да 2-3 градусаў.

Гэтае халоднае морскае арктычнае паветра прасоўваецца далёка на паўднёвы захад Еўрапейскай тэрыторыі Саюза і ўтварае сухое і яснае надвор'е на тэрыторыі БССР на працяглы час.

І. Харлап.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 21—31 сакавіка 1934 г.

Надвор'е ў гэтай дэкадзе ўвесь час трымалася надзвычайна добрае—цёплае і яснае, асабліва ў паўднёвай палове БССР.

Ход тэмпературы паветра быў характэрны тым, што на працягу ўсёй дэкады адзначалася значная розніца паміж тэмпературамі паўночнага ўсходу і паўднёвага захаду БССР, першыя—сістэматычна ніжэй. 21-га сярэдне-сутачныя т-ры хісталіся ад 2 да 8⁰. Далей яна пачала павышацца і 23-га дасягнула 4—10⁰, а 24-га зноў знізілася прыблізна на 2⁰. У наступныя дні на поўнач ад лініі Менск—Магілеў сярэдне-сутачная т-ра трымалася роўная, у межах ад 2 да 5⁰. У паўднёвай частцы т-ра значна павысілася 25-га і 26-га, мясцамі да 11⁰. Пасля гэтага т-ра паступова зніжалася і ў апошні дзень дэкады дасягнула 0—5⁰.

Сярэдняя дэкадная тэмпература хісталася ў межах ад 2 да 7⁰ і супроць нармальнай яна была вышэй прыблізна на 3—5⁰.

Максімальная т-ра хісталася ў вельмі шырокіх межах ад 8 да 18⁰. Мінімальная-ж па ўсёй БССР зніжалася ніжэй 0⁰, у большасці да —2-3⁰. Наогул трэба сказаць, што для гэтай

дэкады, асабліва другой яе паловы, характэрны цёплыя дні і ясныя халодныя ночы з прымаразкамі.

Ападкі выпалі ў наступных колькасцях: у паўночнай зоне і мясцамі каля ўсходняй мяжы БССР выпала ад 10 да 20 мм (у Дрысе 26 мм), у цэнтральнай частцы, у раёне Лепель—Слуцк—Жлобін, выпала ад 5 да 10 мм, у паўднёвай зоне выпала надзвычайна мала, ад 1 да 5 мм. Пераважаючыя колькасці ападкаў па ўсёй БССР выпалі 22-га і 27-га. 26-га і з 28-га па 31-ае ападкаў зусім не было.

У першыя дні дэкады паўсюды адзначаўся туман.

Вятры пераважалі паўднёва-ўсходняй чвэрткі гарызонта, з сярэдняй хуткасцю 4 м/сек.

Воблачнасць хісталася ў значных межах ад 30 да 90% агульнага пакрыцця неба. Вялікая воблачнасць наглядалася пераважна на поўначы БССР, а малая на поўдні.

Н. Малішэўская.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 21—31 сакавіка 1934 г.

У гэту дэкаду ў паўднёвых раёнах пачалася вегетацыя азімых культур. Як адзначаюць метстанцыі, становішча азімых пасеваў, па выхадзе з-пад снегу, здавальняючае. Метстанцыя Васілевічы дае ацэнку вышэй здавальняючае.

Па паўднёвых раёнах пачаўся ранні сеў, а ў паўночных падрыхтоўка глебы да ранняга масавага севу.

Метэаралагічныя ўмовы справаздачнай дэкады спрыялі як пачатку вегетацыі, так і вытвару сельска-гаспадарчых прац. Наглядаўшыяся ў апошнія дні дэкады пахаладанні не былі шкоднымі для вышаўшых з-пад снегу азімых культур.

В. Стэфановіч.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за люты м-ц 1934 г.

Люты месяц у гэтым годзе быў надзвычайна цёплы. Яго сярэднія тэмпературы хісталіся каля —3-4^0, такім чынам на 2-3^0 перавышалі нармальныя. Асабліва высокімі тэмпературамі вызначаліся наступныя перыяды: з 5-га па 11-ае, з 17-га па 20-ае, 23-ае і з 26-га да канца месяца. У гэтыя дні т-ра паднімалася вышэй 0^0. Паміж гэтымі перыядамі наглядаліся перыяды параўнаўча халодныя. Асабліва халоднае надвор'е было з 12-га па 16-ае, калі сярэднія сутачныя т-ры дасягалі —12—15^0.

Мінімальная т-ра за месяц наглядалася ў гэтыя-ж дні, пераважна 14-га, хісталася яна ад —17,^{0}4 да —22,^{0}6. Максімальныя т-ры за месяц наглядаліся ў канцы месяца, пераважна з 23-га па 26-ае, хісталася яна ад 2^0,5 да 8^0,1, прычым вышэй за ўсё была на паўднёвым захадзе БССР.

Ападкі ў большасці выпалі ў колькасцях, блізкіх да нармальных, а іменна 20—30 мм, толькі мясцамі ў паўднёвай палове БССР іх выпала менш—ад 10 да 20 мм. У даволі значных коль-

касцях ападкі выпадалі ў 2-ой пяціднеўцы і потым у перыядзе з 19-га па 23-ае. Наогул-жа трэба сказаць, што на працягу ўсяго месяца наглядалася выпадзенне невялікіх ападкаў, то ў выглядзе снегу, то ў выглядзе дажджу.

У выніку цёплага надвор'я і невялікіх ападкаў, снегавы насціл не дасягнуў значнай вышыні, за выключэннем паўночных раёнаў. На захадзе БССР і на поўдні снегавы насціл быў зусім нязначны, мясцамі к канцу м-ца нават зусім знік.

Вятры ў гэтым месяцы пераважалі заходнія, сярэднія хуткасці іх даволі значныя—ад 4 да 6 м/сек.

Воблачнасць складала 70—80% агульнага пакрыцця неба. У апошнія дні наглядаліся туманы.

Н. Малішэўская.

РАННІ МАСАВЫ СЕЎ З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ КЛІМАТА І НАДВОР'Я

Яшчэ дагэтуль дзе-ні-дзе сярод адсталай часткі працоўнага сялянства, якое яшчэ не аслабанілася ад былой цемры, дзедаўскіх забабонаў, рэлігійнага дурману,—існуе погляд, што быццам ураджай цалкам залежыць ад волі бога, які кіруе надвор'ем і пасылае на палі, у пакаранне за „грахі", ліўні, градабіцця, замаразкі, засухі, або за „добрыя дзеянні" ўзнагароджвае землякроба спрыяючым летам і добрым ураджаем. Адначасова ўпарта захоўваюцца адсталым сялянствам і бацькаўскія звычаі і забабоны, якія датычацца тэрмінаў пачатку і паступовасці палявых работ; ужываюцца старажытныя спосабы апрацоўкі глебы і яе ўгнаення, і гэтак далей. Усё гэта пры царскай уладзе стварыла паступова надзвычайна нізкую ўраджайнасць і давала магчымасць абшарнікам, кулаку і спекулянту эксплаатаваць шырокія слаі бядняцка-серадняцкіх мас, даводзячы іх да пагалоўнага жабрацтва.

Комуністычная партыя і Совецкая ўлада абвясцілі бязлітасную барацьбу адсталым спосабам земляробства, рэлігійнаму дурману і павялі рашучую барацьбу з капіталістычнымі элементамі па ўсяму фронту, яднаючы бядняцка-серадняцкія аднаасобныя гаспадаркі ў калгасныя, узброўваючы іх складанымі с/г машынамі, штучнымі ўгнаеннямі і апошнімі дасягненнямі агратэхнікі. На базе суцэльнай калектывізацыі разгромлен апошні капіталістычны клас—кулацтва на вёсцы.

Лозунг аўладання тэхнікай высунуты тав. Сталіным, а гэта азначае, што пад сельскую гаспадарку, як і пад фабрычна-заводскую вытворчасць, павінна быць падведзена навуковая база, якая пры соцыялістычнай арганізацыі працы здольна ўшчэнт разбіць усе тыя шкодныя ўплывы соцыяльныя, стыхійныя і ідэалагічныя, ад якіх сельская гаспадарка несла і нясе яшчэ часткова дагэтуль мільённыя страты.

У адносінах да земляробства навука вызначае ў шматлікіх кірунках тыя шляхі, ідучы па якім магчыма атрымліваць вынікі, якія могуць паказвацца амаль цудоўнымі ў параўнанні з тым, што мелася дагэтуль і што адсталай масе насельніцтва яшчэ здаецца зусім натуральным, нібы зразумелым „само сабой".

Табліца вынікаў мэтэаралагіччых

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра: Сярэдняя	Тэмпература паветра: Адхіленне ад нормы	Тэмпература паветра: Максімал.	Тэмпература паветра: Дата	Тэмпература паветра: Мінімальная	Тэмпература паветра: Дата	Адносная вільг. у %%: Сярэдняя	Адносная вільг. у %%: Мінімальная	Тэмпература на паверхні глебы: Мінімальная	Тэмпература на паверхні глебы: Дата	Тэмпература на паверхні глебы: Лік дзён з тэмператур. глебы ≤0°	А п: Сума	А п: Норма
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	— 3.6	—	4.4	23	—19.3	14	80	45	—	—	—	38	—
	3	Полацк	— 3.7	+3.1	3.6	27	—22.2	14	85	40	—	—	—	50	23
	—	Вялкія Лукі	—4 6	—	3.2	23	—18.3	14	85	55	—27.2	10	28	8	.
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	— 5.3	+2.2	2.5	23	—22.6	14	85	55	—28.3	14	28	29	27
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	— 3.7	—	3.7	23	—18.3	14	85	35	—	—	—	23	34
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	22	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	22	—
	13	Барысаў	— 3.0	+3.1	5.0	24	—20.4	14	85	45	—	—	—	26	29
	16	Менск	—3.1	+3.7	3.5	23	—18.8	22	85	55	—20.8	4	28	40	37
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	17	—
	23	Мар'іна-Горка	—3.4	+2.5	2.8	24	—17.9	4	90	45	—25.4	14	28	14	25
	25	Асіпавічы	—3.0	+2.8	5.1	26	—18 8	14	85	45	—	—	—	34	—
	10	Орша	— 4.3	+2.8	2.8	18	—20.2	14	85	40	—22.0	14	28	24	27
	19	Горкі	— 4.9	+2.6	2.7	18	—22.0	14	85	50	—32.4	14	28	24	30
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	14	—
	28	Слуцк	—3.0	—	3.2	26	—18.4	22	85	55	—18.0	22	28	27	—
	30	Мар.-Сосны	—2.8	+2.3	5.9	27	—18.2	14	85	55	—22.4	14	28	10	—
	21	Магілеў	— 4.4	+2.3	3.4	11	—21.9	14	85	40	—	—	—	29	30
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	— 4.9	+2.2	2.8	23	—20.7	15	85	50	—	—	—	26	23
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	— 4.2	+2.0	3.1	23	—20.7	16	85	55	—25.8	15	28	13	—
	32	Жлобін	—3.7	+2.3	3.1	11,23	—18.0	14	—	—	—	—	—	17	—
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	—2.8	+2.1	8.1	26	—19.7	16	85	40	—	—	—	24	—
	37	Калінкавічы	—3.1	+2.9	5.7	26	—20.1	16	90	50	—	—	—	15	25
	39	Лельчыцы	—2.6	—	8.1	26	—17.4	14	85	60	—	—	—	23	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	23	—
	45	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	23	—
	38	Гомель	—3.8	+2.6	3.7	11	—18.5	15	—	—	—19.5	15	28	21	—
	35	Васілевічы	—3.4	+2.0	4.9	24	—17.9	16	80	40	—19.4	14	28	25	30
	40	Людвінава	—3.4	+1.5	3.3	26	—22.1	15	80	50	—21.5	15	28	14	—

ых

назіранняў за люты месяц 1934 г.

п	адкі ў мм							Вецер		Воблачн. у 10-балавай сістэме		Інсаляцыя ў %%% магчымай	Лік дзён				Сярэд. выш. снег. насцілу за апошнюю дэкаду	
	Лік дзён з ападкамі																	
Норма	≥ 0.1 мм	≥ 0.5 мм	≥ 1.0 мм	≥ 2.0 мм	≥ 5.0 мм	≥ 10.0 мм	≥ 20.0 мм	Пераважаючы напрамак	Сярэдняя хуткасць	Агульная	Ніжняя		Ясных	Пахмурных	З туманам	З мяцеліцамі	у 1934 г.	норма
—	16	13	8	5	5	1	0	W	5.4	6.9	6.9	—	2	11	10	3	—	—
23	19	14	11	7	3	1	0	W	4.2	7.8	6.7	—	2	14	7	8	34	—
	15	4	3	1	0	0	0	W	7.2	7.5	6.3	—	2	14	3	9	9	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	14	13	10	6	1	0	0	W	5.1	7.3	7.1	20	2	1	5	8	43	40
34	22	13	6	4	1	0	0	NW	5.4	7.9	6.7	—	2	14	6	6	6	—
—	18	9	6	5	0	0	0	—	—	—	—	—	—	—	7	0	18	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2	—	21	—
29	20	12	6	5	2	0	0	W	3.9	8.0	7.2	—	1	16	5	3	9	—
37	23	13	8	6	4	0	0	W	4.3	8.4	6.3	—	1	19	9	1	22	28
—	10	10	8	3	0	0	0	—	—	—	—	—	—	—	0	0	4	—
25	20	10	6	2	0	0	0	W	5.9	7.8	7.3	—	0	18	4	6	14	19
—	20	13	9	6	2	0	0	W	5.2	8.4	7.1	—	0	18	5	9	18	—
27	19	10	8	3	1	0	0	W	4.0	7.7	6.0	—	0	16	4	4	12	32
30	20	13	10	4	0	0	0	W	5.9	7.5	6.5	—	2	16	3	3	24	40
—	15	9	5	1	0	0	0	—	—	—	—	—	—	—	1	0	—	—
—	20	14	8	7	0	0	0	W	6.6	8.4	7.5	—	0	16	8	4	2	—
—	15	6	3	2	0	0	0	W	5.1	7.4	6.8	—	0	14	11	5	1	—
30	18	15	8	5	5	0	0	W	4.1	7.9	7.2	—	1	17	1	5	13	41
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
23	17	14	12	4	0	0	0	W	5.4	7.5	7.4	—	4	17	4	2	15	
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	17	9	4	3	0	0	0	W	3.7	6.3	6.1	—	3	12	4	1	22	—
—	15	11	6	3	0	0	0	W	5.5	7.1	6.3	—	2	12	6	4	7	—
—	17	10	7	5	1	0	0	W	4.9	8.3	6.7	—	0	17	7	2	13	—
25	13	8	6	2	0	0	0	W	4.7	7.2	6.1	—	2	15	6	5	3	21
—	18	13	9	3	0	0	0	W	4.7	7.7	7.2	—	2	15	6	3	1	—
—	21	13	8	4	1	0	0	—	—	—	—	—	—	—	5	1	15	—
—	10	9	7	4	1	0	0	—	—	—	—	—	—	—	3	0	2	—
—	16	10	6	4	0	0	0	W	4.1	7.4	6.1	—	2	16	7	5	12	27
30	20	13	8	5	1	0	0	W	4.9	7.4	6.7	24	2	14	5	4	10	19
—	22	8	5	2	0	0	0	W	5.3	7.3	6.3	—	2	14	1	3	11	5

У першую чаргу гэта датычыцца колькасных паказчыкаў ураджаю, які, напрыклад, па асноўных зернавых культурах—жыту, пшаніцы, аўсу, можа быць даведзены да 20 цэнтнераў з га, замест 5—7, што ў аднасобнікаў лічылася ўжо вельмі добрым вынікам нават у найбольш спрыяючыя годы. У сучасны момант у любым соўгасе або калгасе аграном можа пералічыць мерапрыемствы, якія для гэтага патрэбны, а разгортваючаяся шпаркімі тэмпамі механізацыя апрацоўкі глебы і правядзення палявых работ, выраб штучных угнаенняў і соцыялістычныя метады працы здольны забяспечыць, на падставе чоткіх канкрэтных дырэктыў партыі і ўраду, стопроцантны поспех азначаным мерапрыемствам.

Сцвярджаючы гэта, мы быццам нахільны ніяк не ўлічваць надвор'е і наогул „стыхійных", неспрыяючых альбо спрыяючых умоў надвор'я на ўраджай. Гэта, зразумела, памылковае ўражанне і менавіта таму, што кажучы аб навуковай падставе агратэхнічных мерапрыемстваў мы да ліку апошніх адносім, зразумела, і тыя ўплывы, якія робіць на с.-г. расліны клімат мясцовасці і бягучае надвор'е. Але з навуковага пункта погляду ўплывы гэтыя ні ў якай ступені не падобны да тых, што ўяўляюцца адсталаму розуму ў выглядзе неперагаможных здарэнняў, якія нібы „абрушваюцца з неба". Наадварот навуковыя падыходы да з'яў надвор'я заключаюцца ў тым, каб вывучыўшы дасканальна іх фізічную прыроду, скарыстаць спрыяючыя бакі і змагацца з шкоднымі і небяспечнымі для сельскай гаспадаркі. З гэтага пункту погляду і будуць у далейшым разгледжаны пытанні ўплыва клімата і надвор'я на ўраджай.

На расліны наогул і ў прыватнасці на с.-г. культуры, галоўным чынам, уплываюць тры метэаралагічныя фактары, або элементы надвор'я: тэмпература, якая з'яўляецца мерай цеплыні, ападкі, якія ствараюць вільготнасць глебы і паветра, і сонечныя праменні, падаючыя або проста на расліны або ўкосна, шляхам дыфузнага праменавання з боку воблакаў і атмасферы.

Тэмпература, як кожнаму добра вядома, падлягае значным зменам на працягу года. Найбольш важным момантам яе гадовага ходу з'яўляецца, як кажуць, пераход яе праз 0 градусаў увесну, што адпавядае пачатку паступовага раставання і знішчэння снегавога пакрова, за якім следам ідзе раставанне і праграванне верхніх пластоў глебы і ўскрыццё рэк. У паасобныя гады надыход гэтага часу вагаецца ў даволі шырокіх граніцах і тэрміны знішчэння пакрова, зразумела, наогул больш позьнія ў паўночных раёнах, чымся ў паўднёвых.

Нармальным, адпавядаючым, гэтак кажучы, „кліматычным стандартам" нашай краіны трэба лічыць прамежуткі паміж 18—23 сакавіка на поўдні, 26—30 сакавіка на поўначы. Але ў паасобныя гады гэтыя тэрміны могуць перасоўвацца ў той ці іншы бок амаль што на 2 тыдні, напрыклад, у мінулым 1933 годзе ўжо ў канцы сакавіка па ўсёй нашай тэрыторыі паветра дасягнула 4-5 градусаў цеплыні; з другога боку ў 1931 г. даволі значны снегавы насціл трымаўся ўсюды амаль да 25-га красавіка. Разбежка, як бачым, значная, але з гэтага толькі робім вынік, што для пачатка палявых работ нельга вызначаць нейкага сталага, нерухомага тэрміна, а трэба ўлічваць асаблівасці

надвор'я бягучага году, аб якіх, дарэчы, можна ў галоўных рысах атрымліваць патрэбныя звесткі праз радыё ад Беларускага Бюро надвор'я. Гэты крок вельмі важны, бо ён дазваляе планава, падрыхтавацца да пачатку веснавой кампаніі.

Чым павінен быць адзначаны гэты план у той яго частцы, якая датычыцца тэрмінаў выезда ў поле?

У тым, каб не губляючы ніводнай мінуты разгарнуць сеў, як толькі становішча глебы дазволіць гэты выезд, нават „выхад“ у поле, у паасобных выпадках па вопытных участках так званай звышранняй сяўбы. Можа, аднак, паўстаць пытанне, чаму патрэбна такая спешка? Якая небяспека ў тым, што пасеў будзе ўтварацца на 10—25 дзён пазней, у тэрміны больш „зручныя“, больш адпавядаючыя бацькаўскім прывычкам? Адказ на гэта дае сама прырода, калі ўважліва прыглядзецца да яе „паводзін“ у веснавы час. Сапраўды, ледзь толькі зыйшоў снег, як пачынае паўсюды зелянець пустазелле і праз 5—7 дзён ужо можна бачыць вынікі „падзімага сева“, які самацёкам адбыўся з боку дзікай расліннасці самых рознастайных сартоў. Тут сапраўды не губляецца ні мінуты і ўсе гэтыя „дзеці прыроды“ імкнуцца скарыстаць як мага паўней і першыя праменні вясенняга сонца і багаты запас вільгаці, што насычае глебу пасля раставання снегавога пакрыцця. Нічога не баіцца гэтае пустазелле—ні магчымых яшчэ ў гэты ранні час зваротаў халадоў і выпадання снега, ні позніх прымаразкаў, ні надта хуткага ўздыму тэмпературы пры адсутнасці ападкаў, як гэта часамі здараецца ў пачатку вясны. Якраз наадварот, усе гэтыя неспрыяючыя выпадковасці „стыхійных уплываў“ акурат з'яўляюцца тым менш небяспечнымі, чым раней пачала развівацца і загартоўвацца маладая рунь.

Чаму-ж, паўстае пытанне, не можа следваць гэтаму прыкладу „культурная расліна“. Ці сапраўды яна створана, гэтак кажучы, з „другога цеста“, з'яўляецца больш вымагальнай і далікатнай, чымся натуральны мясцовы раслінны пакроў?

Нам здаецца, што для большасці нашых зернавых, маючых якраз выдатную адносную вагу ў нашай гаспадарцы, трэба даць на гэтае пытанне адмоўны адказ. Сапраўды—пшаніца (яравая), авёс, лён, не кажучы ўжо аб азімых—жыце і пшаніцы, зусім не баяцца халадоў, нават даволі значных, а па сутнасці небяспека галоўным чынам пагражае з гэтага боку пры ранніх тэрмінах пасева. Іншая справа для тых раслін, якія сапраўды ад прымаразкаў могуць значна пацярпець, нават зусім згінуць, як некаторыя гародныя культуры, гуркі, таматы, у меншай ступені з зернавых—грэчка, з бабовых фасоля і г. д. Тут патрэбен у кожным выпадку асабісты падход да справы, але ў пытанні масавага ранняга сева нас цікавяць якраз не гэтыя больш пераборлівыя расліны. Тыя-ж, што пералічаны вышэй, як ужо сказана, ніякай шкоды ад ранніх тэрмінаў сева не пацерпяць.

Але гутарка ідзе не аб шкодзе, а карысці ад ранняга сева, перавагах апошняга ў параўнанні з больш позні́м. А перавагі гэтыя настолькі істотныя, што адным толькі ўдалым выбарам тэрміна сева магчыма значна павысіць ураджай, не кажучы ўжо аб тым, што дадае з свайго боку агратэхніка і хімізацыя глебы.

сапраўды, ні ў якую іншую пару года мы не знаходзім такога ўдалага злучэння спрыяючых вегетацыі метэаралагічных фактаў, як у раннюю вясну. Паветра яшчэ чыстае і празрыстае з нязначнай колькасцю вадзяной пары, не засмечанае пылам і мікробамі раслінных хвароб. Сонечныя праменні праходзяць праз яго з найменшымі стратамі і ў складаным іх комплексе прысутнічае якраз і вельмі каштоўная так званая „кароткая ўльтрафіалетная“ частка, якая, як паказваюць доследы, спрыяе росту раслін, тэмпература паветра атрымлівае хуткі ўздым на працягу красавіка-мая, сонца падымаецца ўсё вышэй і вышэй на небасхіле, дні становяцца больш доўгімі, шпаркімі тэмпамі праграваюцца верхнія яшчэ значна вільготныя пласты глебы.

Няцяжка бачыць, што ўсе метэаралагічныя паказальнікі вегетацыйных працэсаў злучаны ў гэты час найбольш спагадным і ўдалым чынам, і расліна, якой у гэтую пару ўжо давялося выглянуць з зямлі, павінна пачаць развівацца ў самых спрыяючых і здаровых умовах. Нажаль, звычайна гэтае становішча рэчаў трымаецца нядоўга. Побач з нарастаннем цеплыні, наглядаецца хуткае падсыханне глебы і даволі звычайная пагроза больш-менш зацяжной вясны—недахоп вільгаці—пачынае пагражаць расліне. А пагроза гэта зусім рэальна, па-першае, таму, што ападкі ў красавіку-маі ў нашым клімаце яшчэ нязначныя і паўторнасць іх мінімальная ў параўнанні з летняй парой года; падругое, паветра яшчэ даволі беднае вадзяной парай,—„адносная вільгаць“ яго, як кажуць, у маі, напрыклад, таксама, з усіх месяцаў, з'яўляецца найбольш нізкай, таму выпарванне вільгаці з паверхні глебы, страта тых запасаў, што накапіліся за час раставання снега, адбываецца вельмі хутка. Глеба сохне, распыляецца; на паверхні ад выпадаючых дажджоў можа ствараецца скарынка, якая перашкаджае прарастанню зярняці, або пыл разносіцца ветрам, засмечвае ніжэйшыя пласты паветра, асядае на маладых лістках і стварае гэтым значную перашкоду нармальнаму адбыванню вегетацыйных працэсаў. Усё гэта не страшна больш-менш развітай, узмацніўшайся ўжо расліне, але можа вельмі значна знізіць жыццездольнасць маладога калíва. У выніку, зусім зразумела, атрымаецца зніжэнне ўраджая, прыгнечанне як роста, так і плоданашэння, большая падатлівасць расліны да шматлікіх хвароб, што пагражаюць ёй з усіх бакоў. Усё гэта вельмі добра ўлічваецца дзікімі раслінамі, пустазеллем, таму яны так спяшаюцца скарыстаць першыя вясеннія дні.

Можа, аднак, паўстаць пытанне, якую-ж карысць прыносіць ранні сеў у тых выпадках, калі вясна, якая пачалася нават вельмі рана, у далейшым будзе разгортвацца марудна, са зваротамі халадоў, снегам, дажджамі і моцнымі вятрамі. Ці не загіне рана пакінуўшае зямлю каліва ад усіх гэтых адмоўных уплываў і ці не лепш было-б некалькі спазніцца і пачаць сяўбу ў той час, калі надыходзячае лета ўжо дасць гарантыю, што рунь пачне першыя крокі свайго жыцця ў нармальных умовах бягучага надвор'я.

Разбярэмся ў гэтым пытанні, да рэчы кажучы зусім рэальным, як паказаў сумны прыклад мінулага года. Снег, як ужо памянута, зышоў, амаль паўсюды ў канцы сакавіка надвор'е стаяла па ўсіх паказальніках даволі блізкае да нармальнага.

Дзякуючы гэтаму ў шмат якіх раёнах БССР разгарнуўся звышранні сеў, пераважна аўсу і ільну, бадай што з самага пачатку красавіка. Але пачаўшаяся вясна вельмі хутка змянілася зноў амаль сапраўднай зімой. Тэмпература ўвесь час трымалася значна ніжэй нормы, снег на працягу красавіка выпадаў амаль штодзённа аж да 23-га чысла, нават у Случчыне, не кажучы аб паўночных раёнах. Дзён з марозамі ў красавіку было ад 20-ці на поўначы да 15-ці на поўдні, і толькі ў адным напрамку май адзначаецца з дадатнага боку, гэта ў тым, што позьнія замаразкі ў гэтым месяцы адсутнічалі амаль зусім.

Такім чынам разглядаемую вясну трэба прызнаць мала спрыяючай нармальнаму развіццю с.-г. культуры, але ўсё-ж такі няздольную стварыць рэальную пагрозу для пасеваў. Гутарка можа ісці толькі аб затрымцы развіцця, а не аб карэнным папсаванні будучага ўраджаю. Падругое, трэба адзначыць, што ніякай істотнай розніцы ў характары надвор'я паміж паасобнымі часткамі тэрыторыі БССР не наглядалася. Пры гэтых малапрывабных метэаралагічных умовах адбыўся па 60 калгасах, у 12-ці раёнах нашай рэспублікі (Расонскім, Гарадоцкім, Горацкім, Шклоўскім, Крупскім, Слуцкім, Асіпавіцкім, Пухавіцкім, Бабруйскім, Жыткавіцкім, Хойніцкім) нават звышранні сеў ільну або аўсу, тэрміны якога прыпадаюць на розныя чыслы першай паловы красавіка. Але на гэтым не канчаюцца адмоўныя бакі мінулай пасеўнай кампаніі. Нельга недаацэньваць і ролі лета ў справе канчатковага стварэння ўраджаю. Каб да канца ўявіць сабе становішча рэчаў, неабходна спыніцца і на разглядзе ўмоў надвор'я ў чэрвені. Бадай што яшчэ ў большай ступені, як па нізкіх тэмпературах (цеплыні), так і па высокай хмарнасці, колькасці ападкаў, чэрвень 1933 года істотна адрозніваецца ад усіх прывычных нашых уражанняў аб сонечнасці, цеплыні і лагоднасці летняй пары года, і калі мінулы красавік можна параўнаць па характару надвор'я з лістападам, дык чэрвень наўрад ці істотна адрозніваўся ад канца верасня, пачатка кастрычніка.

Адзін толькі ліпень сапраўды з'явіўся светлай плямай на сумным фоне вегетацыйнага перыяда мінулага года.

Які-ж быў лёс ураджая, што атрымаўся ў выніку ранняга сева пры гэтых выключна неспрыяючых умовах надвор'я. Шматлікія анкетныя даныя, якія маюцца па аўсу і ільну, дазваляюць зрабіць наступны вывад. Ураджай у сваёй большасці выпадкаў атрымаўся не толькі „нармальны", але, у параўнанні з пасевамі больш познімі, у шмат якіх выпадках і значна перавышаючым гэтыя нормы. Так, напрыклад, па аўсу дэтальны падлік паказвае, што раннія пасевы ў агульным выніку далі па зярну на кожныя 1000 га каля 3000 цэнтнераў і каля 4000 цэнтнераў па саломе збытку ў параўнанні з пасевамі больш познімі. Нельга адмаўляць, што гэтыя лічбы ўжо заслугоўваюць „некаторай увагі", у адносіне ільну ў мінулым годзе радам з атрыманнем высокіх лішкаў ад ранніх пасеваў у параўнанні з познімі на асобных участках былі адваротныя выпадкі. Трэба, аднак, падкрэсліць, што ні ў якім разе нельга адмоўныя выпадкі адносіць толькі за кошт надвор'я. Сапраўды, калі мы запытаем сябе, у чым можа быць прычына адмоўных адхіленняў, дык першае, што можа прыйсці ў галаву, гэта шукаць гэтую прычыну ва ўмовах

надвор'я. Але што-ж гэта за дзіўны ўплыў надвор'я, якое на адлегласці якога-небудзь дзесятка кіламетраў у адным месцы спрыяе, у другім пагаршае тую-ж самую справу? Уплыў надвор'я настолькі агульны і аднастайны па сваёй прыродзе, што калі-б у ім была прычына, ніводная спроба ранняга сева на невялікіх адлегласцях не павінна была-б даць станоўчых рэзультатаў у 1933 годзе. Але-ж анкеты паказваюць, што паміж зусім агіднымі зніжэннямі ўраджаю наглядаюцца ў кожным раёне і якраз процілеглыя выпадкі перавышэнняў. Як магчыма гэта растлумачыць „стыхійнымі" прычынамі? Тэрміны сева ў абодвых выпадках амаль супадаюць, глебы таксама ва ўмовах аднаго раёна наўрад ці істотна адрозніваюцца адна ад аднэй, таму адзіны праўдападобны вынік той, што ў дрэнных выпадках прычынай быў проста дрэнны падыход да справы, а іменна: ігнараванне элементарных агратэхнічных мерапрыемстваў (выбар участка, падрыхтоўка і якасць насення, заробка насення), адсутнасць практыкі і свядомы сабатаж. Шэраг станоўчых вынікаў па ільну сведчыць аб тым, што нават выключна неспрыяючае надвор'е вясны 1933 года не здолела знішчыць зусім яскравых пераваг, якія павінен прыносіць ранні сеў пры належным падыходзе да справы. Нельга, зразумела, адмаўляць, што лён з'яўляецца некалькі больш пераборлівай культурай у сэнсе агратэхнічных, глебавых і метэаралагічных паказчыкаў, чымся, напрыклад, авёс, гэта карэнная расліна сярэдніх і паўночных шырот. Але з гэтага вынікае толькі тое, што пры пасевах ільну трэба з асаблівай увагай і дэтальным улікам усіх бакоў справы падыходзіць да яе ажыццяўлення, адводзячы пад лён лепшыя зямельныя ўчасткі з адпаведнымі папярэднікамі на іх, і добра памятаваць, што ў канчатковым падрахунку лёс ураджая вырашаецца не надвор'ем, а падрыхтоўкай і суровым ужываннем агратэхнічных правілаў і соцыялістычных метадаў працы. Адначасова трэба падкрэсліць і тое, што доследы апошніх гадоў канчаткова развеялі тыя трывогі, якія яшчэ нядаўна існавалі наконт уплыву замаразкаў на лён. У свой час (пачатак 1932 г.) гэта знайшло адбітак і ў брашуры аўтара, прысвечанай „нармальным тэрмінам с.-г. палявых работ па БССР", дзе раілася „не рызыкаваць надта ранімі тэрмінамі пасева ільну", з прычыны магчымасці пашкоджання яго замаразкамі. У сучасны момант гэтая асцярожнасць павінна быць прызнана беспадстаўнай і ад яе трэба адмовіцца на карысць магчыма ранніх тэрмінаў сева.

Нарэшце апошнія заўвагі. У выпадку занадта гарачай і сухой вясны таксама трэба схіліцца ў бок перавагі ранняга сева, бо і ў гэтых умовах расліна лепш скарыстае запасы вільгаці, якія ствараюцца ў глебе пасля раставання снега. Пры познім звароце халадоў іх таксама павінны лепш вытрымаць ужо ўзмацніўшыяся, больш развітыя расліны, чым зусім маладая, нетрывалая рунь. Што-ж датычыцца карысці ранніх тэрмінаў сева з фітапаталагічнага пункта гледжання (захворванне раслін), дык аб гэтым няма двух спрэчных думак: рана пасеяныя расліны па ўсіх нязіраннях значна менш гінуць ад хвароб, чым тыя, што пасеяны ў больш позні час. Усе гэтыя меркаванні нават наводзяць на думку, што ў нашых умовах значную карысць маглі-б прыносіць і так званыя „падзімныя" пасевы

яравых і нават некаторых гародніх культур, але з прычыны навізны гэтага пытання мы толькі можам на сёнешні дзень параіць аграномам звярнуць асаблівую увагу на асвятленне яго практыкай у магчыма хуткім часе. Наогул-жа ўсю сваю моц захоўвае лозунг—„Магчыма раннія тэрміны сева ў аснову мерапрыемстваў па падвышэнню ўраджайнасці соцыялістычных палёў".

Да ўсіх пералічаных довадаў метэаралагічнага зместа трэба дадаць яшчэ і тое істотнае меркаванне, што пачынаючы як мага раней палявыя работы па высеву шэрага культур, займаючых буйнае месца ў нашых севазваротах, кожная гаспадарка атрымлівае магчымасць у значнай ступені знізіць напружанасць вясенняй палявой кампаніі і адначасова чотка і рацыянальна складаць адпаведныя планы працы і скарыстання цягавай сілы, інвентару і расстаноўку брыгад. І гэты довад павінен быць улічаны не ў апошнюю чаргу, пакольні ён датычыцца аднэй з важнейшых умоў падвышэння ўраджайнасці—менавіта належнай арганізацыі працы.

А. Кайгарадаў.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Члены рэдкалегіі:
Ф. Рабаконь
А. Кайгарадаў
Б. Лісіцкі
І. Калько
І. Рачыцкі.

Друкарня БелАН. Зак. № 144. Гарліт № 2767 Тыраж 1000 экз. 1 арк.

МОСКВА



Москва
Софийская Набережная
№ 38
Гидрометеорологическая
станция ЦБК.

Галоўнае Кіраўніцтва
[illegible] Службы
Б. С. С. Р.
Мінск



